2. Интерактивная карта: Траугуттово (Trauguttowo) [Электронный ресурс]. URL: https://www.google.com/maps/d/edit?mid=1Lt_ATuai-geS6aXOQ5fnQ1W_R6lm PMiN&usp=sharing. – Дата обращения: 22.05.2022.
3. Architektura i budownictwo. Miesięcznik ilustrowany. – Warszawa : S.W.A.P, 1936. – 416 s.
4. Научно-технический отчет «Обследование технического состояния конструкций здания городского Дома офицеров, расположенного по адресу: г. Брест, ул. Жукова, 1». – Брест: БрГТУ, 2008. – 277с.

УДК 711.168

А. А. Петрухін,
вядучы архітэктар LEVEL80 architects

# ПАДЫХОДЫ Ў ЗАХАВАННІ РАЁНАЎ ДРАЎЛЯНАЙ ЗАБУДОВЫ Г. ГРОДНА
# APPROACHES IN THE CONSERVATION OF WOODEN BUILDING AREAS OF HRODNA

*Анатацыя: Праблема захавання архітэктурнай драўлянай спадчыны актуальна для Беларусі і для горада Гродна ў прыватнасці. Унікальнасць раёнаў «Новы Свет», «Настаўніцкая Калонія», «Занёманскае Прадмесце» палягае ў комплексна захаваўшайся драўлянай забудове, якая стварае асаблівую атмасферу гістарычнага цэнтра. У той жа час адсутнасць ахоўнага статуса будынкаў і ўвагі да раёнаў з боку гарадскіх уладаў, як і неразуменне непасрэднымі ўласнікамі будынкаў іх гістарычнай каштоўнасці вядзе да паступовай дэградацыі раёнаў. Аўтарам прапанаваныя 2 падыходы да захавання гістарычных раёнаў на падставе досведа еўрапейскіх краін.*
*Annotation: Preservation of wooden architectural heritage is significant problem both for Belarus and for Hrodna in particular. Uniqueness of the neighborhoods «Novy Sviet», «Nastaйnickaja Kalonija», «Zaniomanskaje Pradmiescie» lies in preserved wooden building areas that creates specific atmosphere of the historical center. At the same time, absence of conservation status of buildings and lack of attention to the problem from the city authorities, as well as misunderstanding of historical value of the buildings by their owners causes stable degradation of the neighborhoods. There are 2 approaches to preserve historical neighborhoods based on European experience that are proposed by the article author.*
*Ключавыя словы: драўляная забудова, гісторыка-культурная каштоўнасць, драўляны канструктывізм, рэгенерацыя гістарычнай забудовы, канцэпцыя ўстойлівага развіцця.*
*Key words: wooden buildings area, historical and cultural value, wooden constructivism, historical buildings regeneration, sustainable development conception.*

Дрэва – традыцыйны матэрыял для беларускай архітэктуры, што абумоўлена прыроднымі асаблівасцямі нашага рэгіёна і адсутнасцю альтэрнатыўных варыянтаў, даступных для шырокага выкарыстання. Тым не менш у свядомасці большасці гараджан драўляная архітэктура даволі часта ўспрымаецца як нешта не вартае ўвагі. У той жа час у прафесійным дыскурсе драўлянае дойлідства з'яўляецца аб'ектам вывучэння шырокага кола спецыялістаў, пры гэтым больш увагі надаецца культавым аб'ектам (напрыклад, Палесся), драўляным сядзібам шляхты ці так званай беларускай народнай архітэктуры вясковых хат і гаспадарчых пабудоў. Аднак у гарадскім кантэксце драўляныя кварталы застаюцца па-за ўвагай як гарадскіх уладаў, так і архітэктараў, рэстаўратараў, саступаючы па сваёй мастацкай вартасці гістарычным будынкам з цэглы і каменю.

Сярод беларускіх гарадоў, якія захавалі ў сваёй горадабудаўнічай структуры паўнавартасныя кварталы гістарычнай драўлянай забудовы, вылучаецца ў першую чаргу Гродна, дзе можна назваць 3 падобныя раёны: «Новы Свет», «Настаўніцкая Калонія» і т.зв. «Занёманскае

Прадмесце». Унікальнасць дадзеных раёнаў палягае ў тым, што гэта менавіта гарадская драўляная забудова іншай планіровачнай структуры і канструктыўных асаблівасцяў дамоў, а не інкарпарыраваная ў горад вёска. Найбольшай разнастайнасцю стыляў, матэрыялаў і форм вылучаюцца «Новы Свет» і «Настаўніцкая Калонія», дзе прысутнічаюць у тым ліку прыклады мадэрновых гарадскіх сядзіб, дамоў з характэрнай жоўтай гродзенскай цэглы, драўляныя дамы ў т.зв. закапанскім стылі і г.д. Тут жа захаваліся асобныя прыклады зусім рэдкай з'явы на нашых землях – дамы, што былі пабудаваны ў 20–30-я гг. ХХ ст. ў стылі т.зв. драўлянага канструктывізму, ці як яго яшчэ часам называюць, польскага драўлянага функцыяналізму [1].

Нягледзячы на ўсе цікавыя асаблівасці раёнаў драўлянай забудовы, статус гэтых тэрыторый дагэтуль канчаткова не вызначаны. Пры распрацоўцы «Праекта зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці «Гістарычны цэнтр г.Гродна», «Занёманскае прадмесце" і «Новы Свет» патрапілі часткова ў межы ахоўнай зоны, а «Настаўніцкая Калонія» не патрапіла зусім. Праўда, на гэтыя тэрыторыі распаўсюджваюцца рэгламенты зон рэгулявання забудовы, якія, аднак, з большага зводзяцца да высотных абмежаванняў. Больш за тое, толькі 4 помнікі драўлянага канструктывізму па вуліцы Мядовай патрапілі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей з амаль паўсотні экзэмпляраў т.зв. шараговай забудовы к. ХІХ – пач. ХХ стст. Адсутнасць ахоўнага статуса дазваляе сучасным і патэнцыйным уласнікам кардынальна змяняць знешні выгляд будынкаў, а пад час і ўвогуле значна перабудоўваць ці руйнаваць іх пад свае патрэбы [2].

Да нядаўняга часу прапановы па развіцці цэнтральнай зоны г. Гродна насілі экстэнсіўны характар. Напрыклад, праект рэгенерацыі 1989 г., нягледзячы на даволі прагрэсіўныя падыходы для тых часоў, папросту пазбягаў гэтых кварталаў, цалкам засяродзіўшыся на трансфармацыі «цагляна-каменых» кварталаў. Праект 2004 г. зайшоў на тэрыторыю вышэй згаданых кварталаў, але ж яны з нагоды зацікаўленасці ўладаў ды даволі павярховага аналізу патэнцыяла трактаваліся проста як рэзервовыя пляцоўкі для размяшчэння шматпавярховага жылля. Паступова ў кампетэнтных гарадскіх службаў замацаваўся стэрэатып, што раёны «Новы Свет» і «Настаўніцкая Калонія» неабходна разглядаць толькі ў якасці пляцоўкі для рэалізацыі жаданняў інвестараў, бо гэтаму спрыяе з аднаго боку фактычная блізасць да гарадскога цэнтра Гродна, а з іншага – нязначныя абмежаванні па рэалізацыі маштабных праектаў [3].

Не менш значнай праблемай у захаванні асаблівай атмасферы кварталаў драўлянай забудовы з'яўляецца адсутнасць усведамлення ў большасці мясцовых жыхароў (і непасрэдных уласнікаў) каштоўнасці і значнасці будынкаў паасобку і вышэйзгаданых раёнаў агулам. Некаторыя дамы, што дасталіся ў спадчыну новым гаспадарам, амаль перасягнулі 100-гадовы рубеж. Уласнікі, каб давесці якасць жылля да больш-менш прымальных стандартаў, паступова мяняюць аўтэнтычныя матэрыялы даху з бляхі на шыфер, шалёўку – на нізкаякасны і штучны сайдынг, драўляныя вокны з ліштвамі – на пластыкавыя шклопакеты. Такім чынам, крок за крокам адбываецца дэградацыя архітэктуры будынка, а разам з гэтым незаўважна губляецца і genius loci – дух месца.

Між тым праблема захавання культурна-гістарычнай спадчыны раёнаў драўлянай забудовы не з'яўляецца выключна беларускім пытаннем. Драўляная архітэктура распаўсюджана ў многіх краінах Еўропы, але ж найбольш характэрна для прыбалтыйскага і паўночна-еўрапейскага рэгіёнаў, дзе развіліся і ахоўваюцца асаблівыя адносіны з лесам і традыцыйным драўляным дойлідствам.

Большасць будынкаў (больш за 90 %), пабудаваных у Літве да 1940-х гг., з'яўляюцца драўлянымі пабудовамі. У Савецкі перыяд стаўленне да драўлянай забудовы было супярэчлівым, але ж пачынаючы з 1990-х практычна кожнаму дому, узведзенаму да Другой сусветнай вайны, быў нададзены статус нерухомай культурнай каштоўнасці рэгіянальнага значэння. У дадзены момант Літва прапаноўвае спецыяльныя турыстычныя паслугі, якія арыентаваны на знаёмства з драўлянай спадчынай Літвы. Асабліва ў гэтых адносінах вылучаецца горад Паланга, у якім захаваліся і мадэрновыя драўляныя сядзібы пач. ХХ ст. і асоб-

ныя экзэмпляры архітэктурнага стыля функцыяналізм, выканананыя у нетыповым для дадзенага стыля матэрыяле – драўніне.

У Швецыі з піетэтам адносяцца да драўлянай забудовы сваіх гістарычных гарадоў, бо на працягу стагоддзяў гэты матэрыял быў асноўным для ўзвядзення жылых і грамадскіх будынкаў. 3 драўляныя горады (Tre trästäder) Экша, Ю і Нора (Eksjo, Hjo, Nora) – гонар і турыстычная славутасць Швецыі. Горад Ю ў 1990 г. атрымаў ганаровы медаль ад міжнароднай арганізацыі Europa Nostra, якая спецыялізуецца ў сферы захавання спадчыны, за адметную рэстаўрацыю драўлянага горада з захаваннем арыгінальнага выгляду і духа [4].

Старая частка фінскага горада Раўма ўнесена ў спіс аб’ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта найбуйнейшы ў краінах Паўночнай Еўропы цэльны гістарычны драўляны горад, дзе на тэрыторыі ў 28 гектараў размешчаны каля 600 будынкаў і стала пражывае блізу 600 чалавек. Выбітную ролю ў функцыянаванні і захаванні драўлянага раёна займае рэнавацыйны цэнтр Тамела, які арганізоўвае мерапрыемствы, прысвечаныя захаванню драўлянай спадчыны і традыцыйных канструкцый. На тэрыторыі цэнтра размешчаны банк запасных частак, якія могуць быць выкарыстаны ізноў пры рэканструкцыі драўляных дамоў. Больш за тое, Тамела прапаноўвае паслугі сталярнай майстэрні, дзе жыхары горада могуць скарыстацца інструментам, пракансультавацца са спецыялістамі і навучыцца даглядаць за драўлянымі канструкцыямі [5].

Падсумаваўшы прыклады з сусветнай практыкі па працы з гістарычнай драўлянай забудовай, можна вылучыць 2 асноўныя падыходы, якія могуць быць ужытыя і ў беларускім кантэксце.

Першы падыход – «канцэпцыя ўстойлівага развіцця» – стварэнне не музея, а «жывога» асяроддзя. Захаваць дом у першапачатковым выглядзе амаль немагчыма, калі гаворка не ідзе пра музеефікацыю. Паступовае прыстасаванне дома пад патрэбы саміх жыхароў – нармальны працэс, які прадугледжвае ў тым ліку пракладку разнастайных камунікацый. Пры гэтым могуць узнікаць і новыя жылыя дамы (на свабодных участках) без абавязковай адбудовы дакладных копій некалі існаваўшых будынкаў, але ў той жа час неабходна ўвага да кантэксту, да стылістычных асаблівасцяў суседняй захаваўшайся забудовы. Самае ж галоўнае, што пры дадзеным падыходзе не абыйсціся без актыўнага ўдзелу гарадской адміністрацыі, органаў мясцовага кіравання, іначай рэнавацыя драўляных дамоў застанецца прэрагатывай толькі багатых гараджан. Горадам мусяць быць прапанаваныя не толькі фінансавыя магчымасці па падтрымцы ўласнікаў гістарычных драўляных будынкаў, але і запушчана спецыяльная праграма (магчыма, пры падтрымцы не дзяржаўных агенцый) у адукацыйна-выхаваўчым накірунку з мэтай змянення грамадскай думкі аб раёнах драўлянай забудовы ў бок павышэння яе грамадскага прызнання і каштоўнасці.

Другі падыход прадугледжвае магчымасць захавання аб’екта/аб’ектаў шляхам яго пераноса на новае месца з магчымасцю стварэння так званых скансэнаў, альбо музеяў пад адкрытым небам. Такі падыход актуальны ў выпадках калі некалькі будынкаў, вуліца, раён больш не маюць гаспадароў, тады ўзнікае магчымасць стварэння экспазіцыі з улікам не толькі архітэктурнага, але і этнаграфічнага складнікаў. Таксама магчымы выпадак, калі пэўныя горадабудаўнічыя ўмовы вымагаюць поўнай трансфармацыі раёна, але ж прысутнічае магчымасць захавання і пераноса асобных будынкаў на новае месца. У найбольш поўным, разгорнутым варыянце магчыма дэманстрацыя народнай культуры, гарадскога побыту, пэўных рамёстваў, тэхналогій мінулага з магчымасцю інтэрактыўнага відовішча.

Такім чынам, правільная трансфармацыя раёнаў драўлянай забудовы г. Гродна і то бок інтэнсіфікацыя і граматнае ўшчыльненне існуючай структуры, будзе спрыяць больш збалансаванаму і інтэнсіўнаму развіццю гарадскога цэнтра. Пры гэтым адбудзецца пашырэнне разумення «старога цэнтра» Гродна не толькі як «цагляна-каменнага», але і разнастайнага ў сваёй архітэктуры, характары, атмасферы. Як вынік, у Беларусі і ў Гродна з’явіцца ўнікальны культурна-турыстычны брэнд, а жыхары горада будуць больш усвядомлена ставіцца да гістарычна-архітэктурнай спадчыны роднага горада.

*Літаратура:*
*1. Перспектывы драўлянага гістарычнага цэнтра Гродна // Гісторыя і архітэктура Гродна [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : https://harodnia.com/be/poszuki/idei-dlia-horada/17-perspektyvy-draulianaj-harodni. – Дата доступа : 19.05.2022.*
*2. «Проект зон охраны историко-культурной ценности «Исторический центр г. Гродно»» // Архіў бягучага справаводства УП «БелНІІПГрадабудаўніцтва».*
*3. «Детальный план исторического центра г. Гродно с проектом регенерации исторической застройки» // Архіў бягучага справаводства УП «БелНІІПГрадабудаўніцтва».*
*4. About Three wooden towns // Official website of the network Tre Trästäder [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.tretrastader.se/en/about-us/. – Date of access: 19.05.2022.*
*5. Old Rauma // Official website of UNESCO world heritage site of old Rauma [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.vanharauma.fi/en/. – Date of access: 19.05.2022.*

УДК 69.059

Р. М. Платонова,
кандидат технических наук,
Белорусский национальный технический унирверситет
А. Т. Зеленков,
директор «Фирма САЛЮС», г. Новополоцк

## АНАЛИЗ ТЕХНИЧЕСКОГО СОСТОЯНИЯ ЛОКОМОТИВНОГО ДЕПО КРУЛЕВЩИНА В ДОКШИЦКОМ РАЙОНЕ
## ANALYSIS OF THE TECHNICAL CONDITION OF THE KRULEVSCHINA LOCOMOTIVE DEPOT IN THE DOKSHITSKY DISTRICT

*Аннотация: Рассмотрено объемно-планировочное и конструктивное решение здания локомотивного депо, расположенного в поселке Крулевщина Докшицкого района. На основании технического обследования здания, полученного после визуального и инструментального обследования строительных конструкций, выполненных поверочных расчетов и анализа полученных результатов, сделаны выводы о техническом состоянии конструкций и даны соответствующие рекомендации, необходимые для его дальнейшей реконструкции и надежной эксплуатации.*
*Abstract: The volume-planning and constructive solution of the locomotive depot building located in the village of Krulevschina of the Dokshitsky district is considered. Based on the technical survey of the building obtained after visual and instrumental inspection of building structures, performed verification calculations and analysis of the results, conclusions are drawn about the technical condition of the structures and appropriate recommendations are given for its further reconstruction and reliable operation.*
*Ключевые слова: объемно-планировочное, конструктивное решение, локомотивное депо, техническое обследование, строительные конструкции, поверочные расчеты, рекомендации, реконструкция.*
*Keywords: space-planning, constructive solution, locomotive depot, technical inspection, building structures, verification calculations, recommendations, reconstruction.*

В настоящее время в рамках Государственной программы «Транспортный комплекс» на 2021–2025 гг.» (подпрограмма «Железнодорожный транспорт) реализуются инвестиционные проекты, которые включают в себя поэтапное обновление локомотивов и моторвагонно-